# «Яго вялікасць эцюд»

***Пад такой назвай у межах праекта мастацкай галерэі «Зачараваныя родным краем» у Мазырскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна адкрылася персанальная выстава вядомага ў горадзе мастака-жывапісца Анатоля Налівайкі.***



Анатоль Налівайка працуе настаўнікам малюнка, жывапісу і кампазіцыі ў Мазырскай дзіцячай мастацкай школе з 1981 года (пасля заканчэння мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педагагічнага інстытута). Вучыць майстэрству не толькі дзяцей, але актыўна займаецца творчасцю сам. Як лічаць яго калегі, Анатоль Мікалаевіч – цудоўны мастак-каларыст, які валодае тонкім густам і ўнікальным разуменнем каляровай культуры. Асноўныя напрамкі яго творчасці – пейзажы, нацюрморты, тэматычныя карціны.

На выставе прадстаўлены толькі жывапісныя палотны. Можна падоўгу стаяць і любавацца казачнай непаўторнасцю налівайкаўскага пейзажа. Вось, напрыклад, карціна «Ціхая восень», дзе адлюстраваны куточак нашага Мазыра. Золатам гараць бяроза, клён, неба зацягнута шэранню, за дрэвамі ўзносяцца да неба крыжы Мікалаеўскай царквы. Глядзіш на ўсё гэта – і адчуваеш замілаванне ад прыгажосці роднай зямлі. Бярозы, як факелы, выпісаны на карціне «Над Прыпяццю». Луг пакрыты касмылямі сухой травы. А над усім гэтым – чароўна-таямнічае неба, якое выклікае розныя пачуцці і асацыяцыі. Родным, дарагім успрымаецца ўсё тое, што мастак з любоўю вымаляваў у карціне «Старая запруда». Перад намі – водная гладзь, у якую глядзіцца неба і на якой трымаюцца шырокія лісты лотаці. І ўсё гэта абступаюць магутныя, пышныя волаты-вербы...



«Над Прыпяццю»



«Ціхая восень»



«Старая запруда»

Прысутныя на адкрыцці выставы далі высокую ацэнку творам мастака і падзякавалі яму. Музычны настрой пад час імпрэзы стваралі навучэнцы дзіцячай школы мастацтваў № 2 Дар'я Карасёва і Эвеліна Нячаева, у выкананні якіх прагучалі творы Машкоўскага, Іенсена, Баха, Моцарта.

Аляксей СОЛАХАЎ
Фота аўтара